# У імя новага пакалення

Мінздароўя, ЮНІСЕФ і ЕС яднаюць намаганні ў захаванні здароўя маці і дзяцей на забруджаных тэрыторыях.

Кожнае наступнае пакаленне з пункту гледжання эвалюцыі — больш дасканалае, а значыць, больш каштоўнае. Таму аберагчы патомства — задача архіважная, Праект «Дзеці Чарнобыля», ініцыяваны Прадстаўніцтвам ЮНІСЕФ у Беларусі і Міністэрствам аховы здароўя, прысвечаны захаванню здароўя жанчын І дзяцей на забруджаных тэрыторыях. Фінансавую частку бярэ на сябе Еўрасаюз. Агульныя аб'ёмы падтрымкі ацэньваюцца прыблізна ў мільён долараў.

Праект, разлічаны на два гады, з'яўляецца працягам доўгатэрміновага гуманітарнага супрацоўніцтва з заходнімі партнёрамі. Асноўная яго задача — паляпшэнне якасці мадыцынскага абслугоўвання дзяцей, моладзі і жанчын на тэрыторыях, якія пацярпелі ў выніку аварыі на ЧАЭС. Праект нацэлены на падрыхтоўку і павышэнне кампетэнтнасці спецыялістаў, якія аказваюць медыцынскую дапамогу на забруджаных тэрыторыях, — адзначыў прадстаўнік ЮНІСЕФ у Беларусі Юрый Аксамітны. Ён зрабіў акцэнт на такіх аспектах праграмы, як фарміраванне здаровага ладу жыцця, прафілактыка шкодных звычак у падлеткаў, інфармаванне насельніцтва аб карысці ўжывання ёдаванай солі. Не менш важнае і садзейнічанне фарміраванню ўстановак пазітыўнага і ўсвядомленага бацькоўства, скіраванае на паляпшэнно ведаў і навыкаў па доглядзе дзіцяці, адносінах і гупьні. Падчас рэалізацыі праекта на пацярпелых ад аварыі тэрыторыях будзе створаная сетка цэнтраў, дружалюбных моладзі. Апроч таго, будзе палепшана і аснашчанасць тамтэйшых устаноў аховы здароўя: на закупку сучаснага медыцынскага абсталявання плануецца скіраваць каля 650 тыс. долараў. Мяркуецца набыць, у прыватнасці, апараты штучнай вентыляцыі лёгкіх, інкубатары для нованароджаных, фетальныя маніторы (для дыягностыкі функцыянальнага стану плода і вызначэння жыццёва важных пакаэчыкаў маці). Такім абсталяваннем плануецца папоўніць 15 устаноў Брэсцкай, Гомельскай і Магілёўскай абпасцей. Як патлумачыла Алена БОГДАН, начальнік аддзела медыцынскай дапамогі маці І дзецям у структуры Міністэрства аховы здароўя, выбіраліся тыя медыцынскія ўстановы, сярод пацыентаў якіх найбопьшая колькасць пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС. Яна запэўніла, што дзеянне праекта распаўсюджваецца на ўсе звены ланцуга (пачынаючы ад падрыхтоўкі спецыяліс-таў) і ў роўнай меры прадугледжвае доступ да паслуг і сельскага, І гарадскога насельніцтва.

— Праз два гады пасля рэалізацыі гэтага праекта супрацоўніцтва не спыніцца, — запэўніў Жазэ Мануэль Пінту Тэйшэйра, кіраўнік Прадстаўніцтва Еўракамісіі ў Беларусі і ва Украіне, — гэта толькі частка агульнай карціны.

Ён падкрэсліў, што з канца 2008 тода Еўрасаюэ настроены на пашырэнне і паглыбленне супрацоўніцтва з Беларуссю, у сувязі з тымі паляпшэннямі, якія назіраюцца ў краіне. Спадар Тэйшэйра нагадаў, штоў ЕС ёсць упаунаважаныя структуры, што рэгулярна праводзяць пераацэнку сітуацыі ў краінах, з якімі супрацоўнічае Еўрасаюз. І дадаў: «Мы не адмаўляемся ад сваіх абавязацельстваў і настроеныя на пашырэнне супрацоўніцтва пры ўмовв, што ў краіне будзе чадавацца ўвага важным для нас галінам».

***З.Варанцова***

**Источник:** Звязда.-2009.-17 снеж.-С.2.